*Л. М. Гаўрына,*
*дацэнт*

# ФАЛЬКЛОР – АСНОВА МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

Вядомыя кампазітары розных краін неаднаразова адзначалі залежнасць музычнага мастацтва ад народных вытокаў. У прыватнасці, аб гэтым казаў М. І. Глінка, які падкрэсліваў, што музыку стварае народ [1, с. 48]. М. А. Рымскі-Корсакаў у «Летописи моей музыкальной жизни» пісаў, што ён прыслухоўваецца да галасоў народнай творчасці і прыроды, бярэ напетае і падслуханае ў аснову сваёй творчасці [2, с. 125]. Такія ж думкі мы сустракаем і ў тэарэтычных працах П. І. Чайкоўскага, выказваннях заходнееўрапейскіх кампазітараў Э. Грыга, Б. Бартака і інш.

У музыцы цесная сувязь з народнымі вытокамі больш відавочная, чым у іншых відах мастацтва. Меладычна-гукавое багацце, яе ладавы строй, тэмбравыя і кампазіцыйныя традыцыі – усё гэта выйшла з фальклору. Вялікія скарбы музычнага фальклору, назапашаныя чалавецтвам за многія стагоддзі яго гісторыі, песні і інструментальныя найгрышы ёсць ва ўсіх народаў зямлі. Няма такога этнасу, нават самага маленькага, які б не меў свайго песеннага фальклору, надзвычай самабытнага і непаўторнага. Гэта і абрадавыя, і гістарычныя, і лірычныя, і бытавыя песні. У фальклорным абрадзе, дзе музычны кампанент – важная частка, людзі выказвалі свае мары аб багатым ураджаі, шчаслівым паляванні, аб лепшым жыцці, думкі аб працы, смерці. Імкненне да незалежнасці, волі знайшло адлюстраванне ў разбойніцкіх, рэкруцкіх, паўстанцкіх песнях. Адначасова з вакальнымі формамі ў народзе былі распаўсюджаны розныя жанры інструментальнай музыкі: ваенныя або паляўнічыя сігналы, жалейкавыя найгрышы пастухоў, удары барабана, бубна, мелодыі, якія суправаджалі танцы, шэсці.

Натуральна, што музычны фальклор народ удасканальваў і шліфаваў на працягу стагоддзяў, перадаючы яго з пакалення ў пакаленне. Адсюль і вялікая мастацкая вартасць лепшых узораў народнай музыкі, якія не перастаюць нас здзіўляць сваёй трапнасцю і жыццёвай мудрасцю. Але музычны фальклор каштоўны не толькі як увасабленне ідэалаў і думак народа. У ім мы знаходзім першакрыніцы той музычнай мовы, якой карыстаюцца кампазітары-прафесіяналы. Усё тое, што складае выразныя сродкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесійнай музыкі: інтанацыі, рытмы, ладавыя строі, агульнапрынятыя формы і спецыфічная гукавая палітра, – у той або іншай ступені бярэ пачатак у народным мастацтве.

Такім чынам, любы сродак музычнай выразнасці, якім карыстаюцца кампазітары, спачатку існаваў у народна-песеннай практыцы. У фальклоры ўзніклі і пэўныя віды сугуччаў, уласцівыя той або іншай нацыянальнай культуры, і розныя формы шматгалосся, і характэрныя рытмы танцаў. Музычныя элементы народнай песні і танца стварылі тую нацыянальную мову, якая адрознівае беларускую музыку ад рускай, французскай, італьянскай, нямецкай і г. д. Сувязь з фальклорам, залежнасць ад канкрэтных вытокаў складаюць адну з важнейшых праяў нацыянальнага стылю ў музыцы. Аб гэтым сведчыць, у прыватнасці, разнастайнасць ладоў у народнай і прафесійнай музыцы розных нацыянальнасцей. У славянскіх народаў шырока распаўсюджаны мелодыі ў так званым пераменным ладзе – хістанне паміж мажорам і паралельным мінорам. У некаторых народаў песні гучаць аднагалосна або ва ўнісон, але і ў іх складваецца свая спецыфічная гармонія. Жывое гучанне народнай песні з усімі яе інтанацыйнымі асаблівасцямі, як і найгрышы народнага інструмента, заключае ў сабе нацыянальную самабытнасць.

Традыцыі цеснай узаемасувязі прафесійнага музычнага мастацтва і фальклору асабліва яскрава выяўляюцца ў музыцы славянскіх кампазітараў. Гэта тлумачыцца тым, што ў гэтых мясцінах даўжэй, чым на Захадзе, захавалася вусная народна-песенная традыцыя. Многія кампазітары звярталіся да фальклору, вывучэнне якога не было для іх самамэтай. Гэта дапамагала ім рабіць сваё прафесійнае музычнае мастацтва зразумелым і блізкім народу. Але своеасаблівасць нацыянальнага стылю кампазітараў не абмяжоўваецца толькі запазычанасцю народна-песенных мелодый або іх вольным творчым увасабленнем. Вялікую ролю адыгрывае тут уздзеянне самых разнастайных відаў нацыянальнай культуры. Гэта і народны эпас, розныя жанры тэатральнага мастацтва, паэзіі, народных танцаў і г. д.

Услаўляючы Радзіму, кампазітары звярталіся да вобразаў нацыянальных эпасаў. Так, старажытныя германскія міфы натхнілі Р. Вагнера на стварэнне цыкла опер «Кольцо нибелунга», К. М. Вэбера – «Вольный стрелок». Чэшскія легенды і паданні сталі асновай тэатральна-музычных твораў А. Дворжака – «Русалка» і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Чёрт и Кача». Летапіс «Слово о полку Игореве» паслужыў сюжэтам для оперы А. П. Барадзіна «Князь Ігорь». І сёння папулярны оперы-казкі М. А. Рымскага-Корсакава «Садко», «Снегурочка», «Млада», «Сказание о невидимом граде Китеже и деве Февронии». Кампазітары розных краін у сваіх сачыненнях адлюстроўвалі карціны народнага быту: святы, вясельныя і памінальныя абрады, карагодныя гульні, кірмашы. Гэта і Дж. Бізэ ў музыцы да драмы «Арлезианка», і П. І. Чайкоўскі ў операх «Чародейка», «Черевички», і многія іншыя аўтары і творы.

Не абмяжоўваючыся толькі ўзнаўленнем фальклорных мелодый, кампазітары імкнуліся музычна перадаць і спецыфічныя асаблівасці народнай мовы, яе характэрныя размоўныя інтанацыі. Адсюль вясёлая скорагаворка ў камічных операх кампазітараў-італьянцаў, узвышаная дэкламацыя ў сцэнічных творах К. М. Вэбера, Р. Вагнера і народнае маўленне герояў музычных драм А. С. Даргамыжскага і М. П. Мусарскага. Апошнія імкнуліся не проста перадаць мову персанажаў, але і ўзнавіць тыя або іншыя яе інтанацыі, раскрыць унутраны, псіхалагічны падтэкст.

Вялікі ўплыў на фарміраванне нацыянальных музычных стыляў зрабіла таксама літаратура, якая, як і музыка, мае вытокі ў фальклоры. Цяжка ўявіць рускую музыку без вершаў А. С. Пушкіна ці М. Ю. Лермантава, нямецкую без Г. Гейнэ, польскую без А. Міцкевіча, грузінскую без Ш. Руставелі, беларускую без М. Багдановіча, І. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі і інш. Кампазітары натхняліся прыгажосцю і своеасаблівасцямі нацыянальнага вершаскладання, а галоўнае – глыбінёй зместу, у якім увасоблены мудрасць, талент цэлага народа. Напрыклад, жанр казкі прыйшоў у рускую оперу разам з сюжэтамі А. Пушкіна, украінскі быт успрыняты рускімі кампазітарамі праз творчасць М. В. Гогаля і Т. Р. Шаўчэнкі.

Такім чынам, у музычным мастацтве перапляліся не толькі плыні розных сфер фальклора, але і ўсёй нацыянальнай культуры. Беларуская зямля таксама славіцца сваёй багацейшай старажытнай народнай музычнай культурай, традыцыйныя ўзоры якой дайшлі да нашых дзён, да іх вельмі актыўна звяртаюцца айчынныя кампазітары і сёння.

---

*1. Асафьев, Б. В.* Михаил Иванович Глинка / Б. В. Асафьев. – Л. : Музыка, 1977. – 371 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Римский-Корсаков, Н. А.* Летопись моей музыкальной жизни / Н. А. Римский-Корсаков. – М. : Музгиз, 1955. – 398 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ